# Прамова тав. В. І. КАЗЛОВА

Дарагі таварыш Лю Шао-цы!
Дарагі таварыш Брэжнеў!
Дарагія таварышы, сябры!

Дазвольце ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларускай ССР сардэчна вітаць вас у сталіцы Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы — горадзе Мінску.

Тысячы кіламетраў аддзяляюць Савецкую Беларусь ад народнага Кітая, Мінск — ад Пекіна. Але адлегласць — дружбе не перашкода. Ваш прыезд у Беларусь, якому ўсе мы вельмі рады, — гэта яшчэ адно яркае праяўленне вялікай і сардэчнай дружбы, што звязвае навекі кітайскі і савецкі народы.

Дружба народаў сацыялістычных краін — найпершая ўмова трыумфу вялікіх ідэй камунізма, неперамožнасці справы міру, дэмакратыі і сацыялізма. Яна грунтуецца на адзінстве нашых мэт у барацьбе за пабудову сацыялізма і камунізма, на гранітным фундаменце марксісцка-ленінскай тэорыі, на непахіснай аснове прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму, братняга супрацоўніцтва і ўзаемнай дапамогі.

Дарагі таварыш Лю Шао-цы, дарагія кітайскія сябры! Працоўныя Савецкай Беларусі з вялікай увагай сочаць за слаўнымі справамі гераічнага і працавітага кітайскага народа. Мы шчыра радуемся выдатным перамогам братняга кітайскага народа ў будаўніцтве сацыялізма, дасягнутым пад кіраўніцтвам Камуні-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

стычнай партыі Кітая, яе Цэнтральнага Камітэта на чале з таварышам Мао Цзэ-дунам.

Дарагі таварыш Лю Шао-цы, дарагія таварышы! Дазвольце яшчэ раз вітаць вас на беларускай зямлі. Прыезд у нашу краіну партыйна-урадавай дэлегацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі паслужыць справе далейшага ўмацавання і развіцця нашай братняй дружбы.

Няхай жыве непарушная дружба вялікіх народаў Савецкага Саюза і Кітайскай Народнай Рэспублікі!

Няхай жыве Камуністычная партыя Кітая і яе Цэнтральны Камітэт на чале з таварышам Мао Цзэ-дунам!

Няхай жыве магутны лагер сацыялізма — несакрушальная апора міру ва ўсім свеце!

* * *

Прамова таварыша Казлова неаднаразова перапыняецца бурнымі апладысментамі працоўных, воклічамі «Ура!».

Прывітанні ўспыхваюць з новай сілай, калі да мікрафона падыходзіць Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі таварыш Лю Шао-цы.